# ЁН СЭРЦЫ МАЛАДЫЯ ГАРТАВАЎ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сёлетнім вераснем Ленінскі камсамол Беларусі адзначае 55-ю гадавіну свайго І з'езда...

55 палымяных, хвалюючых і гераічных гадоў! У іх зліліся магутны поступ чырвонагвардзейскіх атрадаў, звон кавалерыйскіх шабляў, гул і святло першых электрастанцый, спеў жаўрука над шырокімі калгаснымі гонямі... Не злічыць перамог тваіх, камсамольскае племя! І ісці табе ў светлы прасцяг камунізму яшчэ больш велічнай хадою, несучы мары тых, хто не ідзе з табою сёння ў калонах, але хто працай сваёй, энергіяй сэрцаў сваіх пачынаў гэты шлях, набліжаў заранак заўтрашняга дня.

Іх шмат у цябе, верных, надзейных сяброў. Да іх належыць і выдатны дзеяч Камуністычнай партыі нашай краіны і міжнароднага рэвалюцыйнага руху Вільгельм Георгіевіч Кнорын.

...Незабыўны верасень 1920 года. На Заходнім фронце наступаюць польскія легіянеры, на поўдні — урангелеўцы, у тыле лютуюць банды. Як і раней, партыя скіроўвае ўвагу працоўных на абарону краіны, умацаванне Савецкай улады. Загараўся світанак новага жыцця, новага ствральнага дня. У першых шарэнгах на подзвіг і працу ішлі камуністы і камсамольцы.

У верасні 1920 года Цэнтральнае Бюро Кампартыі Беларусі на чале з сакратаром ЦБ КП(б)Б В. Г. Кнорыным пастанавіла звярнуць асаблівую ўвагу на камсамольскі рух, на ўцягненне сялянскай моладзі ў камсамол. В. Г. Кнорын часта прысутнічаў на пасяджэннях ЦБ камсамола, дапамагаў разабрацца ў складаных пытаннях дня, арыентаваў на рашэнне неадкладных задач. Камсамольцы слухалі яго на сваіх сходах, канферэнцыях, пры адкрыцці камсамольскага клуба ў Мінску, разам з ім працавалі на суботніках.

ЦБ Кампартыі Беларусі і асабіста В. Г. Кнорын праяўлялі вялікі клопат аб моладзі, яе адукацыі, працы. «Арганізацыі Саюза моладзі з'яўляюцца падсобнымі Камуністычнай партыі, — тлумачыў В. Г. Кнорын тым, хто недаацэньваў ролю і значэнне моладзі ў пераўтваральнай сацыялістычнай працы.— У іх рыхтуюцца кадры новых членаў РКП(б), новых змагароў за Камуністычную рэвалюцыю рабочага класа. І разгля-

даць арганізацыі Саюза Камуністычнай моладзі, як арганізацыі дзяцей, недапушчальна».

9 верасня 1920 года ЦБ камсамола правяло нараду, на якой прысутнічаў і В. Г. Кнорын. Ён адзначыў у сваім выступленні рост радоў камсамола, заклікаў паскорыць стварэнне камсамольскіх арганізацый у вёсцы, падтрымаў рашэнне ЦБ аб скліканні 24 верасня І з'езда камсамола Беларусі. У парадак дня былі пастаўлены пытанні аб бягучым моманце і задачах моладзі, даклад Цэнтральнага Бюро аб яго дзейнасці, палітыка-асветніцкая і эканамічна-прававая работа сярод моладзі, яе сацыяльнае выхаванне, фізічнае развіццё, дапрызыўная падрыхтоўка і іншыя пытанні.

Скліканню з'езда камсамола папярэднічала вялікая работа Камуністычнай партыі Беларусі па аб'яднанні моладзі ў Камуністычны Саюз, па выхаванні ў ёй якасцяў адданых змагароў за справу пралетарыяту.

Камсамольскія арганізацыі Беларусі пачалі ствараецца пад уплывам рэвалюцыйнай моладзі Савецкай Расіі. Першая камсамольская арганізацыя была створана ў Віцебску, свабодным ад нямецкай акупацыі. Яе прадстаўнікі Е. Сімунін і Ю. Гайдак, а таксама прадстаўнікі Заходняй Камуны, у склад якой уваходзілі незанятыя германскімі акупантамі вобласці Беларусі, удзельнічалі ў рабоце І з'езда РКСМ.

Услед за Віцебскам пачалі ствараецца камсамольскія арганізацыі ў Полацку, Гарадку, Дрысе, Оршы, Мінску, Бабруйску і Мазыры. Яны аб'ядноўвалі вакол сябе моладзь, стваралі асветніцкія клубы, вялі работу сярод вясковай моладзі, арганізоўвалі ваеннае навучанне.

Усёй работай па стварэнні камсамольскай арганізацыі кіраваў Паўночна-Заходні абласны камітэт партыі, сакратаром якога быў верны друг моладзі Беларусі В. Г. Кнорын.

Нарадзіўся В. Г. Кнорын у Латвіі 29 жніўня 1890 года. З пятнаццаці гадоў звязаў свой лёс з рэвалюцыйным рухам. Прыняты ў 1910 годзе ў рады сацыял-дэмакратыі Латышскага краю, В. Г. Кнорын стаў актыўным прапагандыстам марксізму-ленінізму ў Латвіі, працаваў у нелегальных партыйных арганізацыях Рыгі, вёў агітацыйную і прапагандысцкую работу сярод рабочых і сялян, выступаў з лекцыямі і дакладамі ў легальных таварыствах, супрацоўнічаў у сацыял-дэмакратычных газетах і часопісах, зарэкамендаваў сябе таленавітым літаратурным крытыкам і рэвалюцыйным публіцыстам.

Прызваны ў царскую армію ў пачатку першай імперыялістычнай вайны, В. Г. Кнорын трапіў на Заходні фронт, дзе разам з М. В. Фрунзе, К. І. Ландарам, А. Ф. Мяснікоўым змагаўся за завяванне салдацкіх мас на бок рэвалюцыі. Пасля перамогі Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ён быў адным са стваральнікаў Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні Вялікага Кастрычніка ў Беларусі.

Пры падтрымцы В. Г. Кнорына ў снежні 1918 года быў створаны абласны камітэт камсамола на чале з камуністам М. Ахманавым.

Абласны камітэт склікаў 25 снежня 1918 года І з'езд камсамольскіх арганізацый Заходняй Камуны, на якім прысутнічала 43 дэлегаты — прадстаўнікі Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. Дэлегаты заслухалі даклад аб першым з'ездзе РКСМ, далучыліся да ўсіх яго рашэнняў, прынялі праграму і статут абласной камсамольскай арганізацыі.

У рабоце камсамольскага форума прымалі ўдзел кіраўнікі абласной партыйнай арганізацыі А. Ф. Мяснікоў і В. Г. Кнорын.

З'езд вызначыў асноўныя задачы камсамола Заходняй Камуны па прапагандзе ідэй камунізму сярод моладзі, барацьбы за сацыялізм, выхавання непахісных змагароў за справу рабочага класа.

Са стварэннем Беларускай ССР абласны камітэт камсамола Заходняй Камуны надзяліў М. Ахманава, І. Грэйфенбергера і М. Зандэра паўнамоцтвамі па кіраўніцтве камсамольскімі арганізацыямі ў Беларусі.

Рабоча-сялянская Беларусь святкавала сваё адраджэнне. Святкавала магутным яднаннем вакол партыі бальшавікоў і першага Савецкага ўрада Беларусі, гарачым жаданнем узяцца за мірную стваральную працу.

З непахіснай верай у канчатковую перамогу рэвалюцыі, з гарачай пераконанасцю ў здзяйсненні планаў партыі бальшавікоў ўступала ў новае жыццё беларуская моладзь. Пляча ў пляча з партыяй ішла яна да гэтага светлага дня, разам з ёю скіроўвала свой погляд у далягляды будучыні. Шэрагі маладых барацьбітоў раслі і шырыліся. Былі створаны камсамольскія арганізацыі ў Рагачове, Лоеве, Барысаве і іншых гарадах і вёсках. Гэта была маладая, прагная да жывой стваральнай дзейнасці сіла, якую трэба было па-бальшавіцку выхаваць,


С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке